З ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ
«БЕЛАРУСЬ БЫЛА І БУДЗЕ САМАСТОЙНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ, АЛЕ ДЗЯРЖАВАЙ, САЮЗНАЙ З РАСІЯЙ» 2 стар.

ПЕРСПЕКТЫВЫ
ЁСЦЬ У МЕТРО
ПАЧАТАК, НЯМА Ў МЕТРО КАНЦА... 2 стар.

ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА "ЖЫЦЦЁ І ВЕРА" 3 стар.

КНІГАРНЯ
"ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ"
Адама МІЦКЕВІЧА 4 стар.

КРОПКА НА КАРЦЕ
ШАРКОЎШЧЫНЕ — 500 ГАДОЎ 4 стар.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ 5–6 стар.

СЛОВА НІБЫ ПАРАТУНАК
ЛІТАРАТУРНЫ ПАРТРЭТ
Уладзіміра АРЛОВА 7 стар.

ПОДЫУМ
Андрэй АДЖБА – ТЫТУЛАВАНЫ ПРЫГАЖУН 8 стар.

ВЫСТАВЫ
"МОДА — ПОГЛЯД ПРАЗ СТАГОДДЗІ" 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА | РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі | Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

30 кастрычніка 2003 года. № 44 (2862) | Цана 170 рублёў | E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ДЗЕНЬ ААН

Сусветняя супольнасць адзначыла Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Беларусь па праву ганарыцца тым, што стаяла ля вытокаў стварэння гэтай буйной арганізацыі, падпісаўшы Статут ААН 26 чэрвеня 1945 года на ўстаноўчай канферэнцыі ў Сан-Францыска сярод 51 дзяржавы-заснавальніцы.

Наша рэспубліка ўдзельнічае ў рабоце больш як 50 устаноў сістэмы ААН. Адным з галоўных партнёраў Беларусі ў рамках сістэмы ААН з'яўляецца Праграма развіцця ААН (ПРААН). Цяпер для Беларусі дзейнічаюць Другія краінавыя рамкі супрацоўніцтва ПРААН на 2001–2004 гады, якія прадугледжваюць фінансаванне праектаў дапамогі на суму больш як 9 мільёнаў долараў ЗША.

Супрацоўніцтва з ААН — адзін са знешнепалітычных прыярытэтаў нашай дзяржавы. Нядаўнія сустрэчы міністра замежных спраў Сяргея Мартынава з Генеральным сакратаром Кофі Ананам, старшынёй 58-й сесіі Генеральнай Асамблеі Джуліанам Хантам, іншымі высокапастаўленымі служачымі ААН пацвердзілі, што наша краіна разглядаецца кіраўніцтвам арганізацыі ў якасці надзейнага і ініцыятыўнага партнёра.

ПАДАРУНАК АД БАНКА

У Магілёўскім абласным упраўленні АСБ "Беларусбанка" выпушчана стотысячная картка.

Шчаслівым яе ўладальнікам аказаўся электраслесар КІП завода арганічнай хіміі НВА "Хімвалакно" Анатоль Шышкоў. Тут жа была ўручана "залатая картка" кампазітару Ігару Лучанку (на здымку). Па гэтай картцы народны артыст можа атрымаць грошы ў любой краіне.

Фота БелТА.

СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ, НА ІНШЫХ ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Пасланцы больш як 20 буйных прадпрыемстваў Мінска прымуць удзел у 3-й Нацыянальнай выставе "БеларусьЭКСПА-2003", якая пройдзе ў Вільнюсе з 5 па 8 лістапада.

Падобныя выставы праводзяцца ў Літве традыцыйна адзін раз у два гады. У іх прымаюць удзел вядучыя прадпрыемствы нашай краіны. На гэты раз свае стэнды прадставяць мінскія прадпрыемствы "Атлант", "Гарызонт", "Планар", "Крышталь", "Інтэграл", кандытарскія фабрыкі "Слодыч" і "Камунарка", завод ігрыстых він, падшыпнікавы, электрамеханічны, прыборабудаўнічы і іншыя заводы. На адкрытых пляцоўках "БеларусьЭКСПА-2003" будуць дэманстраваць сваю тэхніку трактарны і аўтамабільны заводы сталіцы.

ДОБРЫЯ ФІЛЬМЫ ДОРЫЦЬ ГЛЕДАЧАМ ДАБРАЛЮБАЎ

У сталічным кінатэатры "Цэнтральны" прайшоў творчы вечар, прысвечаны 70-годдзю народнага артыста Беларусі, вядомага кінарэжысёра Ігара Дабралюбава.

Адным з самых любімых і папулярных на ўсёй постсавецкай прасторы стаў фільм "Белыя Росы", пастаўлены па сцэнарыі Аляксея Дударава. А фільм Ігара Дабралюбава "Іван Макаравіч" удастоены ў 1970 годзе Гранпры "Сярэбраная Мінерва" на Міжнародным кінафестывалі ў Венецыі.

У сувязі з юбілеем І.Дабралюбаву ўручаны Ганаровы знак за асобыя заслугі.

У БЕЛАРУСІ ПРЫЗНАНЫ БЕЖАНЦАМІ 690 ЧАЛАВЕК

Як паведамілі ў Прадстаўніцтве Упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, у нашай краіне цяпер статус бежанца маюць 510 афганцаў.

У ліку афіцыйна прызнаных бежанцамі таксама 83 чалавекі з Грузіі, 28 — з Таджыкістана, 27 — з Азербайджана, 23 — з Эфіопіі, 7 — з Палесціны, 5 — з Ірана, 2 — з Індыі...

СНЕГАПАД ПАЧАЎСЯ Ў КАСТРЫЧНІКУ

У гэтым годзе на Беларусі снег не прымусіў доўга сябе чакаць.

Толькі выкапалі бульбу, яшчэ не паспелі вяскоўцы зрэзаць усю капусту, выкапаць буракі, як 22 кастрычніка паўночны цыклон прынёс з сабою замаразкі да мінус 5–6 градусаў і снег. Восеньская шматколернасць змянілася белай афарбоўкай.

ПЕРАЙШЛІ НА ЗІМОВЫ ЧАС

У ноч з 25 на 26 кастрычніка ў Беларусі перайшлі на зімовы час. Стрэлкі гадзіннікаў пераведзены на адну гадзіну назад. Уставаць будзем на гадзіну пазней.

Падрыхтавала **Таццяна КУВАРЫНА.**

анонс

Фота БелТА.

САПІРУЙ, ВОЛЬГА!

Прадстаўляць Рэспубліку Беларусь на першым міжнародным дзіцячым конкурсе песні "Еўрабачанне-1", які пройдзе ў Капенгагене 15 лістапада, будзе дзесяцігадовая школьніца з Кобрына Вольга Сацюк (на здымку).

Займаючыся вакалам у гарадскім Доме дзіцячай творчасці, яна стала лаўрэатам Нацыянальнага конкурсу юных талентаў "Сузор'е надзей" і заваявала пуцёўку на конкурс "Еўрабачанне". Да гэтага юная спявачка не раз удзельнічала ў розных абласных і рэспубліканскіх фестывалях і конкурсах, здзіўляючы гледача не толькі добрым вакалам, абаяльнасцю, арыгінальнымі народнымі касцюмамі, але і ўменнем трымацца на сцэне.

мінск, захарава, 28. дом дружбы

БЕЛАРУСЬ — ІСПАНІЯ

23-24 кастрычніка адбыліся пасяджэнні "круглага стала" на тэму "Беларусь – Іспанія: Выбраныя старонкі грамадска-культурнага ўзаемадзеяння".

Арганізатарамі яго выступілі Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі "Радзіма", Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт і рэдакцыя газеты "Голас Радзімы" пад патранатам Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Міністэрства адукацыі і Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Першае з трох пасяджэнняў "круглага стала" адкрыла на правах гаспадыні старшыня праўлення Беларускага таварыства дружбы Ніна Іванова. Было зачытана прывітанне старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Станіслава Буко.

Усяго на пасяджэннях заслухана 21 выступленне. Усе выступоўцы: вучоныя, грамадскія дзеячы, пісьменнікі, дзеячы мастацтва — раскрывалі розныя сферы ўзаемадзеяння нашых краін, аддаленых у прасторы і адначасова звязаных усебаковымі сувязямі.

Выступленні ўдзельнікаў былі абагульнены у заключным паведамленні. У ім вызначаны шляхі актывізацыі беларуска-іспанскіх сувязей, дзейнасці таварыства "Беларусь — Іспанія".

(Падрабязнасці – у наступных нумарах).

стасункі

"ПАЛЕСКІЯ ЗОРЫ" Ў БЕЛЬГІІ

На галоўнай плошчы бельгійскага горада Ві адбылося выступленне ансамбля "Палескія зоры" Пінскага гарадскога Дома культуры. Канцэрт беларускага фальклорнага калектыву стаў цэнтральным звяном у праграме святкавання жыхарамі горада Дня франкамоўнай камуны – афіцыйнага свята Бельгіі.

Выступленне ансамбля сабрала значную колькасць гледачоў і прайшло з вялікім поспехам. Бельгійцам была прадастаўлена магчымасць пазнаёміцца з беларускімі народнымі танцамі і песнямі, нацыянальнымі касцюмамі. У час канцэрта быў арганізаваны распродаж сувеніраў з беларускай сімволікай, прадукцыі мастацка-рамеснага промыслу.

Перад канцэртам у мэрыі Ві адбыўся афіцыйны прыём з нагоды прыбыцця беларускага ансамбля, у якім прынялі ўдзел мэр горада, сенатар федэральнага парламента Бельгіі Ан-Мары Лізен, члены гарадскога савета, прадстаўнікі Пасольства Беларусі ў Бельгіі.

У выступленні А.-М.Лізен адзначалася, што падобнага роду мерапрыемствы даюць магчымасць бельгійцам пазнаёміцца з мастацтвам, культурай і традыцыямі беларускага народа, уносяць істотны ўклад у развіццё грамадскіх сувязей паміж Беларуссю і Бельгіяй.

Аляксандр МАРХЕЛЬ,
супрацоўнік Пасольства Беларусі ў Бельгіі.

УВАГА!
ГАЗЕТА "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЎКЛЮЧАНА Ў ПАДПІСНЫ КАТАЛОГ РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ НА І ПАЎГОДДЗЕ 2004 ГОДА.

спорт

"ЗАЛАТЫЯ" СКАЧКІ НА БАТУЦЕ

З двума залатымі медалямі вярнуліся з нямецкага Гановера нашы суайчыннікі. У мужчынскіх сінхронных скачках на батуце не было роўных Мікалаю Казаку і Дзмітрыю Палярушу, а ў жанчын — Галіне Лебедзевай і Таццяне Пятрэні.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

з прэс-канферэнцыі

Фота БелТА.

«БЕЛАРУСЬ БЫЛА І БУДЗЕ САМАСТОЙНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ, АЛЕ ДЗЯРЖАВАЙ, САЮЗНАЙ З РАСІЯЙ»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь правёў прэс-канферэнцыю для айчынных і замежных журналістаў, на якой былі разгледжаны актуальныя пытанні беларуска-расійскіх адносін.

Акрамя ўступнага слова кіраўніка дзяржавы і адказаў на шматлікія пытанні, прэс-канферэнцыя ўключыла ў сябе прамы тэлемост з адным з цэхаў Мінскага трактарнага завода, а таксама адказы Прэзідэнта Беларусі на пытанні жыхароў прыгранічных рэгіёнаў і на пытанні, зададзеныя праз Інтэрнэт.

У зале сабралася каля 60 журналістаў, і пытанняў было шмат: аб інфармацыйнай прасторы, аб саюзных праграмах, аб адрозненнях у эканоміцы дзвюх краін, аб тым, што грамадзяне Беларусі, трапляючы ў Маскву, не маюць аднолькавых правоў з расіянамі...

Заявіўшы пра сваё жаданне разнастаіць формы зносін з прэсай і грамадскасцю, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: "Мы ў любым выпадку правялі б гэту прэс-канферэнцыю, каб не залежаць ад "ананімных крыніц". Тым больш, што нацягнутасці ў кантактах з Уладзімірам Пуціным у Прэзідэнта няма: "Мы сябры, у нас ёсць агульныя інтарэсы, ёсць добрыя асабістыя адносіны".

"Беларусь была і будзе самастойнай дзяржавай, — падкрэсліў Прэзідэнт, — але дзяржавай, саюзнай з Расіяй". Што ж, пазіцыі кіраўніцтва сёння адрозніваюцца, але дружба народаў і іх узаемныя пачуцці не падлягаюць сумненню. Таму работа працягваецца ў рамках цяперашняга дагавора.

Галіна ВІР.

перспектывы

У МЕТРО ЁСЦЬ ПАЧАТАК, АЛЕ НЯМА КАНЦА...

Будаўніцтва метро ў Мінску пачалося ў 1977 годзе і доўжыцца да сённяшняга дня. За 25 гадоў вялікай будоўлі ў сталіцы праложана 25 кіламетраў метро.

Цяпер тэмпы будаўніцтва знізіліся з-за змяншэння капітальных укладанняў, бо калі раней фінансаванне ішло за кошт саюзнага бюджэту, то сёння толькі з гарадскога. І ўсё ж цяпер будуецца 0,5 кіламетра метро ў год. Па словах Валерыя ЧАКАНАВА, генеральнага дырэктара "Мінскметрапраекта", ужо запланавана 30 кіламетраў метро і яго трэцяя лінія, якая будзе мець працягласць 17,2 кіламетра, 14 станцый і звяжа між сабой паўночны і паўднёвы раёны праз цэнтр горада. Усяго ж у праекце — 3 лініі з 48 станцыямі працягласцю 58,3 кіламетра.

Развіццё горада вызначае тэмпы будаўніцтва метро, але яно не скончыцца ніколі, бо з'яўляецца сучасным і надзейным відам транспарту. Метро — і самы танны від транспарту. Сёння пасажыры аплачваюць 40 працэнтаў кошту свайго праезду.

У Мінску працуе шмат добрых спецыялістаў як у будаўніцтве метро, так і яго эксплуатацыі. Валерый Чаканаў сцвярджае, што кожная станцыя будуецца з якасных матэрыялаў, з прымяненнем новых тэхналогій і разлічана на 300 гадоў эксплуатацыі. І ў будучыні плануецца захаваць добрую якасць будаўніцтва і высокі эстэтычны ўзровень аздаблення станцый.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКУ: Валерый ЧАКАНАЎ расказвае пра перспектывы мінскага метро.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

гарызонты навукі

НЕРАЗБУРАЛЬНЫ КАНТРОЛЬ

Якасць, надзейнасць, бяспека. Менавіта гэтыя паказчыкі прыярытэтныя ў рабоце калектыву Інстытута прыкладной фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, які адзначае саракагоддзе свайго існавання.

А ўсё пачыналася з аддзела фізікі неразбуральнага кантролю, створанага ў Фізіка-тэхнічным інстытуце акадэмікам Мікалаем Акулавым. Шырокі спектр распрацовак і вялікая зацікаўленасць у іх прамысловасці рэспублікі сталі падставай для ператварэння аддзела ў самастойны інстытут. Асноўнымі накірункамі яго дзейнасці сталі фізіка неразбуральнага кантролю, распрацоўка метадаў і сродкаў неразбуральнага кантролю і тэхнічнай дыягностыкі матэрыялаў, вырабаў і тэхналагічных працэсаў, стварэнне навуковых асноў інфармацыйных тэхналогій неразбуральнага кантролю і тэхнічнай дыягностыкі.

Як адзначае дырэктар інстытута акадэмік Пётр Прахарэнка, ва ўсім свеце даўно зразумелі, што эканомія на кантролі — уяўная эканомія, яна вядзе да значных страт пры ліквідацыі наступстваў аварый і нават катастроф. І сучасная дыягностыка, і неразбуральны кантроль — гарантыя бяспекі. Прыборы, распрацаваныя інстытутам, дазваляюць атрымаць аб'ектыўную інфармацыю аб стане розных дэталей і вырабаў як на стадыі іх апрацоўкі, так і ў працэсе эксплуатацыі. Гэта асабліва актуальна пры стварэнні і эксплуатацыі патэнцыяльна небяспечных тэхнічных аб'ектаў, такіх, як нафта- і газаправоды, абсталяванне хімічнай і нафтаперапрацоўчай вытворчасці і шмат іншага.

Дзесяць рознапрофільных лабараторый інстытута ажыццяўляюць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў галіне магнітнага, электрычнага, радыёхвалевага, акустычнага, радыяцыйнага і іншых метадаў неразбуральнага кантролю. Высокую эфектыўнасць распрацовак забяспечваюць кваліфікаваныя кадры, сярод якіх 17 дактароў і 28 кандыдатаў навук. Вынікам іх штодзённай працы сталі звыш 60 відаў прынцыпова новых, абароненых аўтарскімі пасведчаннямі і патэнтамі сродкаў кантролю, звыш 2 тысяч навуковых артыкулаў, 47 манаграфій. Тысячы прыбораў, распрацаваных у інстытуце, паспяхова працуюць на буйных прадпрыемствах рэспублікі.

Вучоныя інстытута падтрымліваюць творчыя сувязі з калектывамі Расіі, Малдовы, Украіны, Германіі, Фінляндыі, Польшчы, ЗША.

Застаецца дадаць, што інстытут прыкладной фізікі — адзіны ў свеце акадэмічны інстытут, які працуе над праблемамі фізікі неразбуральнага кантролю.

НА ЗДЫМКУ: дырэктар інстытута акадэмік Пётр ПРАХАРЭНКА.

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

шматгалоссе



РУСКІ ХОР СПЯВАЕ ПА-БЕЛАРУСКУ

Па гарадах і вёсках крочыць V Усебеларускі фестываль нацыянальных культур. Яго пачатак зроблены ў Гомелі, дзе 18 кастрычніка ў гарадскім цэнтры культуры адбыўся абласны фестываль. 25-26 кастрычніка эстафету прыняў Мінск. Затым у фестывальны марафон уступяць Міёры Віцебскай вобласці, Гродна, Магілёў, Маладзечна Мінскай вобласці і Брэст. На абласных фестывалях рэспубліканскае журы адбірае лепшыя нацыянальныя калектывы і выканаўцаў для ўдзелу ў выніковых мерапрыемствах у Гродне, якія адбудуцца ў чэрвені 2004 года.

Як і што адбываецца ў нашай сталіцы, заўжды прыцягвае да сябе асаблівую ўвагу.

Сёлета ў фестывалі "Яднанне" прынялі ўдзел больш за 20 нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў. Упершыню пад патранажам Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у фестывалі "Яднанне" прынялі ўдзел грузіны і афганцы. 7 харэаграфічных ансамбляў, 8 хароў, 22 вакальныя ансамблі і мноства індывідуальных выканаўцаў прадстаўлялі свае конкурсныя праграмы ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода. Шматгалосае свята праходзіла пры паўнюткай зале.

Журы вызначыла многа намінантаў, і, здаецца, пакрыўджаных сярод удзельнікаў не было. Асабліва шмат добрых слоў было выказана ў адрас ансамбля армянскага танца "Эрыбуні", хору ўкраінскай песні "Крыныця", ансамбля яўрэйскай музыкі і песні "Мінск Клезмір-бэнд", салістаў Вадзіма Дудаладава, Бажэны Язкевіч, Асіль Альбуздукаевай, паэтаў Міхаіла Ткачова, Айшы Александровіч і Георгія Пушкаша.

Вельмі цікавыя нацыянальныя куткі афармілі ў фае Палаца культуры карэйцы, яўрэі і малдаване, прадставіўшы вырабы народнай творчасці і нацыянальную кухню, што таксама было адзначана вельмі станоўча.

Наша газета "Голас Радзімы", якая пастаянна друкуе на сваіх старонках матэрыялы аб культурным жыцці нацыянальных супольнасцей Беларусі, не засталася ў баку ад такой значнай падзеі, як фестываль "Яднанне" і прапанавала свой уласны прыз за лепшае выкананне твора аб Радзіме. Дыванам з выявай Маці Божай быў узнагароджаны хор рускай песні імя Нікіцінай, які выканаў патрыятычны гімн на беларускай мове.

Віктар МАЦЮШЭНКА.

НА ЗДЫМКУ: прыз рэдакцыі газеты «Голас Радзімы» прымае кіраўнік хору рускай песні Іна БАРЫСАВА.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

хрысціянская старонка «жыццё і вера»

ВІНШАВАННІ

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ ПАПУ РЫМСКАГА ІААНА ПАЎЛА II

16 кастрычніка Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Яго Святасць Папу Рымскага Іаана Паўла II з 25-й гадавінай узыходжання на Найсвяцейшы Прастол і пажадаў яму здароўя, даўгалецця і плённага выканання адказнай місіі.

МІТРАПАЛІТА ФІЛАРЭТА ПАВІНШАВАЛІ І ЎЗНАГАРОДЗІЛІ

Фота БелТА.

23 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і свецкай улады павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з 25-годдзем яго архіпастырскага служэння, а таксама ўручыў яму ордэн Францішка Скарыны. Урачыстая цырымонія адбылася ў Мінскім епархіяльным упраўленні Беларускага Экзархата.

***

Прадстаўнікі Сінода Беларускай праваслаўнай царквы ў дар яго Высокапраасвяшчэнству паднеслі памастацку выраблены напрастольны Крыж.

***

Архіепіскап Лодзенскі і Познаньскі Сімон перадаў на малітоўную памяць ад Польскай праваслаўнай царквы абраз Казанскай іконы Божай Маці.

***

Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II узнагародзіў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта ордэнам Рускай праваслаўнай царквы прападобнага Андрэя Рублёва (першай ступені) за ўвагу да адраджэння епархіяльнага, манаскага і прыходскага жыцця ў Беларускім Экзархаце і ў сувязі з 25-годдзем знаходжання на Мінскай кафедры.

Ордэн быў уручаны Мітрапалітам Варонежскім і Ліпецкім, кіраўніком справамі Маскоўскай Патрыярхіі Высокапраасвяшчэнным Сергіем.

***

Ордэн Украінскай Праваслаўнай царквы святога Нестара Летапісца (першай ступені) уручыў Мітрапаліту Філарэту архіепіскап Львоўскі і Галіцкі Уладыка Аўгусцін.

ПАДЗЯКА ЗА ЎВАГУ

Сардэчна дзякую архіпастарам, пастарам і цывільным, дзяржаўным і грамадскім дзеячам, прадстаўнікам навукавай і творчай інтэлігенцыі, кіраўнікам і веруючым традыцыйных рэлігій, дарослым і дзяцям, якія выказалі свае добрыя пачуцці і шчырыя пажаданні ў сувязі з 25-годдзем майго архірэйскага служэння на зямлі Белай Русі.

Узаемна жадаю ўсім душэўнага спакою, цялеснага здароўя і духоўнай моцы на многія гады для сумеснай працы на карысць блізкага і на карысць беларускай Айчыны.

З глыбокай удзячнасцю Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

ПАКРОЎСКІ КІРМАШ

Шмат мерапрыемстваў прапанавала мінчанам і гасцям сталіцы выстава "Пакроўскі кірмаш", якая праходзіла ў памяшканні выставачнага павільёна "Экспафорум".

Падчас выставы быў арганізаваны продаж царкоўных рэчаў і літаратуры, прадуктаў харчавання, падрыхтавана цікавая інфармацыйна-асветніцкая праграма. Адбыліся лекцыі і сустрэчы з праваслаўнымі мастакамі і пісьменнікамі, семінары, "круглыя сталы".

Асаблівую цікавасць выклікала прэзентацыя кнігі "В послушании преданный", прысвечанай 25-годдзю архіпастырскага служэння на беларускай зямлі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

У выданні сабраны разважанні 95 аўтараў, чые жыццёвыя шляхі былі багатыя сустрэчамі, сумеснай працай ці агульным служэннем з Мітрапалітам Філарэтам. У іх ліку — архірэі і дзяржаўныя мужы, дзеячы культуры і мастацтва, супрацоўнікі Уладыкі, якія неслі послух побач з Яго Высокапраасвяшчэнствам у розныя перыяды яго архіпастырскага служэння.

Кожны дзень на выставе гучалі цудоўная музыка і спевы. Сваё выканаўчае майстэрства прадэманстравалі царкоўныя хары, самадзейныя калектывы.

Усе пяць дзён на выставе жадаючыя маглі атрымаць пачатковыя ўрокі звону, якія давалі выкладчыкі Мінскай школы званароў.

У выставе прынялі ўдзел шматлікія госці з Расіі і Украіны.

Хутка праляцелі дні "Пакроўскага кірмашу". Сярод яго наведвальнікаў былі людзі рознага ўзросту. Дзеці з цікавасцю разглядалі царкоўныя рэчы, знаёміліся з карцінамі, прадстаўленымі ў галерэі "Свет вачыма праваслаўнага мастака". І, хочацца думаць, абагацілі сябе новымі ведамі і ўражаннямі.

Таццяна КУВАРЫНА.

ЖАМЧУЖЫНА ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Касцёлу святога Міхаіла Арханёла, што пабудаваны ў Міхалішках Гродзенскай вобласці, у верасні бягучага года споўнілася 350 гадоў. Гэта адзін з самых старажытных храмаў на Беларусі.

Калісьці Міхалішкі зваліся Вілея, бо стаялі на беразе паўнаводнай ракі-цёзкі Віліі, а потым змянілі імя па прозвішчу сваіх чарговых уладароў Міхальскіх. Гэта мястэчка вядомае з канца XV стагоддзя як паселішча Радзівілаў. Потым тут гаспадарылі сем'і Пронскіх, Кенішкаў. У 1604 годзе Міхалішкі перайшлі да Бжастоўскіх, дзякуючы якім мястэчка вядомае на Беларусі і сёння. Бжастоўскія ў 1622 годзе заснавалі тут кляштар, дзе размясціліся аўгусцінцы. Недалёка ад яго законнікі пабудавалі драўляны касцёл. Кажуць, ён насіў імя Яна Хрысціцеля. Але падчас вайны быў знішчаны. На яго месцы ў 1653 годзе пабудавалі новую святыню, якая існуе і зараз.

На працягу 350 гадоў міхалішскі касцёл не змяніў свайго выгляду ні ўнутры, ні знешне. Час не знішчыў яго прыгажосць. Праўда, вандроўнік, які не заглянуў у сам касцёл, яго знешнім выглядам можа быць не вельмі задаволены, бо будынак выглядае вельмі сціпла: прамавугольны з двухвежавым галоўным фасадам і 5-граннай аспідай ды дзвенявысокія сакрысціі. Барокавая святыня, якую праектаваў віленскі архітэктар-бельгіец Кшыштаф Пэнс, нібы простая сялянская дзяўчына, хараство якой не кожны заўважыць адразу. Не ўзносяцца да неба яго гмахі, памер таксама не ўражвае. Дык чаму ж яго лічаць жамчужынай барока, чаму храм уключаны ў спіс помнікаў архітэктуры Беларусі?

Каб ацаніць прыгажосць аднаго з самых старажытных на Беларусі храмаў, трэба ведаць, што яго афармленнем займаліся вядомы італьянскі скульптар П'етра Пэрэцці, які ўпрыгожваў і вільнюскі касцёл Пятра і Паўла, разам са сваімі суайчыннікамі Янам Марыя Галлі, Андрэа Каноне, Янам Пэнсам. Дапамагалі ім і мясцовыя майстры, але гісторыя захавала імя толькі аднаго з іх — Мікалая Жылевіча. Гэта іх намаганнямі і атрымаўся адзін з самых прыгожых касцёлаў у краіне.

Пад касцёлам знаходзяцца вялікія катакомбы з трунамі Бжастоўскіх.

Праз гэта мястэчка адступалі шведы і, кажуць, пасля няўдалага паходу закапалі тут сваю казну.

Пра Міхалішкі пісаў Аляксандр Пушкін у "Гісторыі Пятра I". Быў тут і Напалеон. Праз Міхалішкі ішлі войскі Барклая-дэ-Толі. Хто ведае, можа ўсе гэтыя людзі заглядвалі ў храм святога Міхаіла Арханёла, каб папрасіць аб заступніцтве. Міхалішскі касцёл выжыў у час першай і другой сусветных войнаў, хоць яны нарабілі шмат шкоды. Намаганнямі парафіян храм быў адноўлены. І зараз прыходзяць сюды людзі, каб падзякаваць Богу за ласку і жыццё.

НА ЗДЫМКУ: Міхалішскі касцёл — помнік ранняга барока на Беларусі.

Галіна СТРОЦКАЯ.

ПЯТРОЎ ФЭСТ

Вілейшчына багатая на традыцыі. Старажылы дбайна адзначаюць святы народнага і царкоўнага календароў. Барані Божа, калі гаспадар пачне якую працу на Стрэчанне, Сёмуху, Пакровы ці іншае свята, ён адразу адчуе ганьбу аднавяскоўцаў. "Нельга працаваць, – скажуць яму. – Свята!"

Самае цікавае, што я назіраў у Вілейскім раёне, гэта прастольныя святы. У самой Вілейцы шырока адзначаецца Дзевятуха, наступленне дзевятага тыдня пасля Вялікадня. А ў Ілы (і гэта зразумела!) – дзень пророка Іллі. Як правіла, у мясцовасці, дзе ёсць сваё адметнае прастольнае свята, маецца царква ці касцёл у імя пэўнага Святога.

На закладным камені Петра-Паўлаўскай царквы, што знаходзіцца ў вёсцы Касута Вілейскага раёна, выбіта дата збудавання: "1868". З таго часу ўжо 135 год спраўляюць навакольныя вёскі прастольнае свята "Пятроўкі".

Званамі збіраюць служкі прыхаджан на малітву. Святочнае набажэнства вядзе айцец Барыс. Каля 12 гадзін раніцы з Крывага сяла, Чыжэвічаў і часткова з Рабуні на машынах, конях і проста пешкі кіруецца вясковы люд да Касуцкай царквы. "На фэст!" – кажуць мясцовыя жыхары.

Яшчэ раз святочна загулі званы. Узрушаныя мужчыны ўрачыста вынеслі з царквы іконы Божай Маці, Пятра і Паўла на аналоях і харугвы. Заспяваў невялікі хор жанчын. Пачаўся хрэсны ход.

Потым натоўп зноў разбіўся на купкі, і людзі накіраваліся на могілкі, каб памянуць памерлых продкаў. Толькі цяпер можна ўжыць кілішак гарэлкі на памін душы.

Фэст працягваецца ў вёсках. Родзічы разыходзяцца па дварах, па дарозе запрашаючы знаёмых і суседзяў на бяседу.

НА ЗДЫМКАХ: фэст ля Касуцкай царквы.

Тэкст і фота **Віктара МАЦЮШЭНКІ.**

дыпкур'ер

СУСТРЭЧА ПАСЛА БЕЛАРУСІ З ПРЭЗІДЭНТАМ БАЛГАРЫІ

Адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя Аляксандра Пятрова з Прэзідэнтам Рэспублікі Балгарыя Георгіем Пырванавым.

Сустрэча была прымеркавана да 10-гадовага юбілею з дня падпісання Дагавора аб сяброўскіх адносінах і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Балгарыя (19 кастрычніка 1993 года).

У ходзе размовы пасол Беларусі адзначыў найбольш значныя моманты, якія характарызуюць стан двухбаковых адносін паміж нашымі краінамі ў апошнія гады, і выказаў гатоўнасць нашай краіны да далейшага развіцця поўнамаштабнага супрацоўніцтва з Балгарыяй.

Прэзідэнт Балгарыі ахарактарызаваў перыяд беларуска-балгарскіх адносін як пазітыўны. Кіраўнік балгарскай дзяржавы адзначыў, што назіраецца актывізацыя супрацоўніцтва практычна па ўсіх накірунках двухбаковага ўзаемадзеяння.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюм краінам неабходна шырэй скарыстоўваць магчымасці гандлёва-прамысловых палат, аб'яднанняў прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Кіраўнік балгарскай дзяржавы адзначыў важнасць правядзення палітычных кансультацый паміж Міністэрствамі замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Балгарыя. Прэзідэнт выказаў задавальненне развіццём супрацоўніцтва ў сферы культуры паміж нашымі краінамі.

Прэс-служба МЗС.

памяць

СЯРОД «ПРАВЕДНІКАЎ НАРОДАЎ СВЕТУ» 400 БЕЛАРУСАЎ

Жалобнае шэсце і мітынг прайшлі ў беларускай сталіцы ў рамках Дзён памяці, прысвечаных 60-годдзю знішчэння мінскага гета. У жалобных мерапрыемствах прынялі ўдзел былыя вязні гета, праведнікі народаў свету, прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады і дыпламатычнага корпуса, міжнародных яўрэйскіх арганізацый і абшчын розных краін.

"Праведнік народаў свету" – гэта афіцыйнае званне, якое Дзяржава Ізраіль прысвойвае грамадзянам іншых нацыянальнасцей з розных краін. Гэта знак глыбокай удзячнасці ўсяго яўрэйскага народа тым, хто, рызыкуючы жыццём, выратоўваў яўрэяў у гады фашысцкай акупацыі. Амаль 16 тысяч чалавек з 32 краін свету ўдастоены гэтага звання. Сярод іх 400 беларусаў.

НА ЗДЫМКУ: у час мерапрыемстваў, прысвечаных 60-годдзю знішчэння мінскага гета.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

вернісаж

ЗНАЁМЦЕСЯ: ПАНцюк-ЖУКОЎСКІ...

Не, паважаныя чытачы, гэта не друкарская памылка. Менавіта так рэклама каля Палаца мастацтва ў Мінску запрашала на выставу жывапісу, аўтар якой так і значыўся: ПАНцюк-ЖУКОЎСКІ. Як прызнаўся мне пазней мастак, такім незвычайным рэкламным ходам ён хацеў прыцягнуць увагу гледачоў да сваёй выставы.

А ўвогуле ніякі ён не пан, а хлопец з палескай вёскі Бабунічы, што ў Петрыкаўскім раёне, — Аляксей Панцюк-Жукоўскі, якому лёс падараваў талент мастака. Але ж рэклама сваю справу зрабіла: выставай зацікавіўся не адзін я. Дарэчы, не лічу сябе ахвярай рэкламы, бо на выставе, якая заняла цэлы паверх Палаца мастацтва, было што паглядзець, пра што падумаць.

"Ля матчынага парога" — надзвычай цёплая назва выставы. Яна, нібы акумулятар, сабрала гэтую цеплыню з кожнай працы мастака. І каб зразумелай была пазіцыя аўтара, паслухаем яго самога. "Для мяне парог — гэта сімвал, пункт адліку, — кажа мастак. — Усе мы праходзім у сваім жыцці праз парог свайго дзяцінства, парог юнацтва. Мы пераступаем парог бацькоўскага дома, уступаючы ў самастойнае жыццё. І я прысвяціў выставу сваім бацькам, а ў іх асобе — усім сялянам Беларусі. Я стараўся ў сваіх працах паказаць жыццё Беларусі і яе гісторыю, сённяшні дзень, данесці да гледача прыгажосць роднай зямлі і яе людзей. І хачу, каб усе, хто прыйдзе на выставу, перанесліся ў думках да свайго роднага парога, да сваіх бацькоў, да сваёй малой Радзімы".

Сапраўды, народжаны і выхаваны ў вёсцы, Аляксей добра ведае самыя тонкія яе дэталі. І тое, што ён малюе, не можа быць набыта іншым шляхам, як самім жыццём. А многія персанажы яго карцін, відавочна, прыйшлі з успамінаў дзяцінства ("Кветкі для казы бабы Полі"). Дакладнасць сюжэтаў, іх праўдзівасць падкрэсліваецца і рэалістычнай манерай жывапісу.

Аляксею Панцюку-Жукоўскаму — 50 год. Гэта ўзрост грамадзянскай і мастацкай сталасці, узрост, у якім думаюць пра вучняў, пра перадачу ім свайго вопыту. Што Аляксей і робіць, выкладаючы ў Беларускім каледжы мастацтва імя І.Ахрэмчыка.

НА ЗДЫМКАХ: Аляксей ПАНЦЮК-ЖУКОЎСКІ; працы мастака: "Кветкі для казы бабы Полі", "Каля студні", "Ля матчынага парога".

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

кнігарня

АДАМ МІЦКЕВІЧ — НА РАДЗІМЕ

Найбольш поўнае выданне твораў вялікага паэта свету Адама Міцкевіча з'явілася ў Беларусі ўпершыню. Маюцца на ўвазе яго "Выбраныя творы", што выйшлі ў папулярнай серыі "Беларускі кнігазбор".

У аднатомніку чытач знойдзе асноўныя творы нашага знакамітага класіка, ураджэнца Навагрудскага раёна (раней — павета). Перш за ўсё — гэта яго лірыка, вершы, у якіх адлюстравалася біяграфія самога паэта, гісторыя яго кахання. У кнізе змешчаны ўвесь цыкл вядомых рамантычных балад Адама Міцкевіча, заснаваных на беларускіх народных паданнях ("Свіцязь", "Свіцязянка", "Лілеі", "Кахаю я", "Курганок Марылі", "Рыбка" і іншыя), а таксама цыклы "Санеты" і "Крымскія санеты", якія зрабілі імя Адама Міцкевіча шырока вядомым у Расіі.

Асобае месца ў творчасці Адама Міцкевіча займаюць яго паэтычныя аповесці "Гражына" і "Конрад Валенрод", у якіх раскрываюцца цікавыя старонкі гісторыі беларускай сярэдневяковай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага і за якія паэта называлі "літоўскім Вальтэрам Скотам". Аповесці прадстаўлены ў кнізе з грунтоўнымі каментарыямі, дарэчы, як і ўсе іншыя творы.

З цікавасцю пазнаёміцца чытач і з самымі буйнымі творамі Адама Міцкевіча — драматычнай паэмай "Дзяды" і паэтычнай эпапеяй "Пан Тадэвуш". У цэнтры першага з іх — рамантычнае каханне паэта да беларускай шляхцянкі Марылі Верашчакі, а таксама трагічная гісторыя віленскіх маладзёжных аб'яднанняў — Таварыства філаматаў і Таварыства філарэтаў, за ўдзел у якіх Адам Міцкевіч з сябрамі быў сасланы "ў глыб Расіі", адкуль эмігрыраваў на Захад. Раздзелы ("песні") "Пана Тадэвуша", напісанага ў эміграцыі, у Парыжы, пераносяць чытача на Беларусь часоў вайны 1812 года з Напалеонам, расказваюць пра ўдзел у ёй беларускай шляхты. Але ў аснове твора — зноў-такі каханне, каханне маладога пана Тадэвуша і шляхцянкі Зосі, за якімі праглядваюцца сам аўтар і яго каханая Марыля.

У раздзеле "Публіцыстыка" змешчаны артыкулы Адама Міцкевіча "Пра варшаўскіх крытыкаў і рэцэнзентаў", "Пушкін і літаратурны рух у Расіі", а таксама ўрыўкі з лекцый, прачытаных паэтам у Калеж дэ Франс (Парыж). З цікавасцю сустрэне чытач і раздзел "Лісты", дзе змешчаны лісты паэта да сяброў і дзеячаў культуры (да Яна Чачота, Ігната Дамейкі, Пятра Вяземскага, Жорж Санд), якія добра дамалёўваюць воблік паэта.

Аднатомнік выбраных твораў Адама Міцкевіча аздабляе багата ілюстрацый, якія расказваюць пра жыццё і творчасць паэта і яго асяроддзе.

Кніга "Выбраныя творы" Адама Міцкевіча — цудоўны падарунак школьнікам, студэнтам, выкладчыкам літаратуры, усім, хто хоча ведаць гісторыю сваёй культуры, хто любіць і шануе мастацкае слова. На жаль, тыраж кнігі невялікі і не ўсе змогуць яе набыць.

Ніна КУДРЭЙКА.

кропка на карце

ШАРКОЎШЧЫНЕ — 500 ГАДОЎ



Маёнтак Шаркоўшчына ўпершыню ўпамінаецца ў пачатку XVI стагоддзя. У 1503 годзе ён быў перададзены вялікім князем літоўскім Аляксандрам магнату Юрыю Дэспат-Зяновічу за асобыя заслугі. З гэтага часу маёнтак стаў перадавацца па спадчыне. Адзін з Зяновічаў, Мікалай, завяшчаў яго сыну Георгію, той — свайму сыну Мікалаю. Урэшце Шаркоўшчына трапіла да Рэгіны Палубінскай (Хамцовай пасля другога шлюбу). У 1604 годзе яна прадала маёнтак вядомаму дзеячу, літоўскаму канцлеру Льву Сапегу, які далучыў Шаркоўшчыну да сваіх маёнткаў Друя і Іказнь. Сапегі валодалі Шаркоўшчынай да 1638 года. Потым маёнтак перадаваўся ў арэнду з рук у рукі.

У 1753 годзе полацкі ваявода Аляксандр Сапега выкупіў маёнтак і прадаў яго Мікалаю (Тадэвушу) Лапацінскаму, брэст-літоўскаму ваяводзе. У 1770 годзе той перадаў маёнтак свайму сыну Яну Нікадзіму, які пабудаваў у Шаркоўшчыне двухпавярховы палац, капліцу, аранжарэю, зрабіў тут сваю рэзідэнцыю — адну з самых раскошных у Дзісенскім павеце. У 1802 годзе адбыўся падзел уладанняў маёнтка, якія складалі 735 валок (або 14 700 дзесяцін) зямлі. Тут налічвалася 2 000 мужчынскіх душ.

Побач з маёнткам былі размешчаны два мястэчкі: Старая Шаркоўшчына і Новая Шаркоўшчына. У Старой Шаркоўшчыне ў сярэдзіне XIX стагоддзя было ўсяго 28 дамоў і 191 жыхар. Да 1897 года колькасць насельніцтва павялічылася ў пяць разоў.

Праваслаўны храм у Старой Шаркоўшчыне ўпамінаецца ўжо ў 1594 годзе. Леў Сапега ў 1639 годзе замест старога храма пабудаваў новую царкву Узнясення. Яна была адноўлена ў 1839 годзе Бернардам Федаровічам. Да царквы адносіўся засценак Тышкова. У 1780 годзе Я.-Н. Лапацінскі ахвяраваў царкве пляц пры ёй і агароды, а таксама дзве валокі зямлі ў асобным кавалку і лугі, запісаў на царкву 4 000 злотых з аплатай працэнтаў.

Мястэчка Новая Шаркоўшчына атрымала гарадское права ў 1767 годзе. У 1776 годзе мсціслаўскі староста Я.-Н.Лапацінскі пабудаваў у Новай Шаркоўшчыне храм у імя святой Ганны, запісаў на яго 8 000 злотых. Там знаходзіліся астанкі яе заснавальніка.

Цяперашняя царква Усіх Тужлівых Радасці ў цэнтры Шаркоўшчыны пабудавана ў 1897 годзе з цэглы на месцы драўлянага храма 1841 года. Першапачатковы выгляд храма вядомы па фотаздымку Я.Балзукевіча 1910-1914 гадоў. Царква — помнік архітэктуры.

Народнае вучылішча ў Шаркоўшчыне было адкрыта ў 1863 годзе. Яно размяшчалася ў грамадскім доме. На яго ўтрыманне адпускалася з дзяржаўнага казначэйства 200 рублёў у год. У 1878 годзе ў вучылішчы атрымлівалі веды 48 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка. Настаўніцай з 1 верасня 1872 года працавала Лізавета Раменская, выпускніца Віленскай жаночай гімназіі. За сваю працу атрымлівала 150 рублёў у год, мела дзяржаўную кватэру. Законанастаўнікам праваслаўнага веравызнання з 1 верасня 1863 года служыў святар Стара-Шаркоўшчынскай царквы Іаан Сушкевіч, які закончыў Літоўскую духоўную семінарыю.

Мала што змянілася ў Шаркоўшчыне і на пачатку XX стагоддзя. Былы настаўнік мясцовага народнага вучылішча Валяр'ян Латышонак успамінаў: "У 1905 годзе вучылішча размяшчалася ў старым драўляным будынку. Працавалі два настаўнікі. У вучылішчы стаяла 25 парт, за якімі сядзелі 60 вучняў. Вучылі чытаць, пісаць, арыфметыку, царкоўныя малітвы".

Сёлета споўнілася 140 гадоў з дня адкрыцця Шаркоўшчынскага народнага вучылішча. Цяпер у пасёлку працуюць дзве вялікія сярэднія школы, якія маюць добра абсталяваныя навучальныя кабінеты. Непазнавальна змяніліся ўмовы працы настаўнікаў і выхавання вучняў.

17 верасня 1939 года Шаркоўшчына ўвайшла ў склад БССР. 15 студзеня 1940 года быў утвораны Шаркоўшчынскі раён, у склад якога ўваходзілі гарпасялковы і 14 сельскіх Саветаў. У раёне пражывала тады 27 368 чалавек. На землях буйных уласнікаў былі створаны два калгасы.

Тры гады, з 22 чэрвеня 1941 да 1 ліпеня 1944 года, на зямлі раёна гаспадарылі нямецка-фашысцкія захопнікі. На тэрыторыі раёна дзейнічалі ў той час падпольныя РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ, якія кіравалі барацьбой партызан і падпольшчыкаў.

Пасля вызвалення пачалося аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі раёна. Значна вырасла, папрыгажэла Шаркоўшчына за апошняе дзесяцігоддзе. Асабліва прывабным стаў цэнтр гарадскога пасёлка з абноўленым будынкам райвыканкама. Набываюць сучасны выгляд і іншыя будынкі. Не пазнаць цяпер былое пыльнае мястэчка.

У раёне разбудаваліся, сталі больш прыгожымі старыя мястэчкі Лужкі, Германавічы, Іёды...

НА ЗДЫМКУ: царква ў Шаркоўшчыне.

Кліменцій КОЖАН,
навуковы супрацоўнік Германавіцкага музея мастацтва і этнаграфіі імя Я.Драздовіча.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ

ВЕСТКІ МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ. № 19

Да сяброў асацыяцыі

Як ужо большасці сяброў ГА "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў" вядома, са снежня мінулага года з-за фінансавых цяжкасцей перапынілася выданне асобнага інфармацыйна-аналітычнага і культуралагічнага бюлетэня "Кантакты і дыялогі". Рабіліся спробы ператварыць ранейшы месячнік хаця б у квартальнік або паўгадавік. Але пакуль што гэтыя спробы вынікаў не далі. А паколькі без свайго органа арганізацыя, у якой налічваецца некалькі соцень сяброў больш чым з 20 краін, існаваць не можа, пасля перамоваў і абмеркаванняў мы выбралі аптымальны варыянт: прасіць "Голас Радзімы", каб старонкі пад той жа назвай змяшчаліся на яе палосах – тым больш, што некаторыя нашы статутныя мэты (да прыкладу, садзейнічаць пашырэнню беларускай культуры ў свеце, развіццю кантактаў паміж краінамі і народамі) у многім супадалі.

І вось з сакавіка бягучага года "Кантакты і дыялогі" з падзагалоўкам "Весткі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў" сталі двойчы ў месяц з'яўляцца на старонках газеты "Голас Радзімы". Цяпер рыхтуецца ўжо дваццаты выпуск. За дзесяць месяцаў надрукавана каля ста артыкулаў, рэцэнзій, аглядаў, карэспандэнцый, прысвечаных грамадска-культурным кантактам Беларусі з іншымі краінамі, прысутнасці беларускай культуры ў свеце, дасягненням асобных беларусістаў, іх новым кнігам. Асвятляліся пытанні рэстытуцыі. Друкавалася бягучая інфармацыя.

Аднак, на жаль, нашы публікацыі даходзяць далёка не да ўсіх беларусістаў. Праўда, мы дамагліся таго, каб некаторым нашым зарубежным калегам (найперш – аўтарам матэрыялаў) нумары газеты пасылаліся бясплатна. Але гэта, хутчэй, выключэнне з правіла. Фінансавыя магчымасці і ў ГА "МАБ", і ў рэдакцыі газеты абмежаваныя.

Сітуацыя была абмеркавана на бюро камітэта нашай асацыяцыі. Дзеля таго каб "Кантакты і дыялогі" даходзілі да адрасатаў у Беларусі і за рубяжом, было прынята неардынарнае рашэнне: **лічыць падпіску на "Голас Радзімы" ўплатай сяброўскіх складак ГА "МАБ"**. Тым самым будуць дасягнуты дзве мэты: "Кантакты і дыялогі" знойдуць новых чытачоў і аўтараў, лягчэй будзе вырашацца пытанне з уплатай сяброўскіх складак, іх перасылкай. Трэба падкрэсліць, што цяпер такая ўплата становіцца адным з доказаў дзейнасці грамадскіх арганізацый у Міністэрстве юстыцыі Беларусі. Калі не хочам падставіць пад сумненне факт існавання нашай асацыяцыі — будзем плаціць сяброўскія складкі шляхам падпіскі на "Голас Радзімы", дзе змяшчаюцца "Кантакты і дыялогі"!

Як жа гэта зрабіць канкрэтна? Пярвічным суполкам у Беларусі мы рассылаем лісты з абвесткамі і бланкамі. Нагадваем, што наш падпісны індэкс у каталогах Беларусі 63854. Цана падпіскі на адзін месяц 1 770 рублёў (зразумела, што больш выгадна афармляць яе адразу на паўгода, а потым паўтараць). Такім жа шляхам можна аформіць падпіску ў тых суседніх краінах (Расія, Украіна, Малдова, Літва, Латвія, Казахстан, Таджыкістан, Кыргызстан), дзе газета ўключана ў каталогі.

Што ж датычыцца іншых краін, то тут давядзецца карыстацца чэкамі на прад'яўніка, даслаўшы яго ў рэдакцыю. Кошт гадавога камплекта газеты для краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы — 50, астатніх — 60 долараў ЗША. А гэта ненамнога даражэй, чым атрымлівалася пры аплаце асобнага бюлетэня "Кантакты і дыялогі" (яго перасылкі). Затое чытач атрымае дадатковую і больш свежую інфармацыю.

Просім патэнцыяльных падпісчыкаў мець на ўвазе, што наступны год будзе для нашай асацыяцыі вельмі напружаны. У ім павінен прайсці IV Міжнародны кангрэс беларусістаў, іншыя важныя падзеі. Да таго ж калектыў рэдакцыі газеты імкнецца ўзняць яе інтэлектуальны і інфармацыйны ўзровень, зрабіць больш цікавай і аператыўнай, больш арыентаванай на інтэлігенцыю, дзелавых людзей. "Голас Радзімы" — адзінае беларускае выданне, якое шырока асвятляе пытанні міжнародных кантактаў, жыцця дыяспары, нацыянальных супольнасцей краіны.

Ад кіраўнікоў суполак у Беларусі, зарубежных нацыянальных і рэгіянальных асацыяцый, індывідуальных сяброў мы чакаем паведамленняў, як выконваюцца статутныя патрабаванні — ідзе ўплата сяброўскіх складак шляхам падпіскі на "Голас Радзімы", якая цяпер падрабязна інфармуе аб справах аб'яднання.

Адам МАЛЬДЗІС,
старшыня ГА "МАБ".

Прысутнасць беларускай культуры ў свеце

Дзве кнігі пра сумежжы культур

Elżbieta Smułkowa. Białoruś i pogranicza. Studia o języku i społeczeństwie. Warszawa, 2002. S. 651. Pogranicza języków. Pogranicza kultur. Studia ofiarowane Elżbiecie Smułkowej. Warszawa, 2003. S. 392. Гэтыя дзве кнігі аб'ядноўвае постаць прафесара Эльжбеты Смулковай, польскага вучонага-лінгвіста, доктара габілітаванага, аўтара звыш 150 навуковых прац. У 1991-1995 гадах – спачатку Генеральны Консул, а затым Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь. Да 2002 года загадчык кафедры беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку.

Асноўны накірунак навуковай дзейнасці Э.Смулковай – даследаванне сумежжаў народаў, моў, дзяржаў, культур. І ў сувязі з гэтым – тэарэтычнае абгрунтаванне пэўных палажэнняў, якія датычацца сумежжа. Асноўная частка прац Э.Смулковай пабудавана на матэрыяле польска-беларуска-літоўскага сумежжа. Таму Беларусь у яе даследаваннях прадстаўлена шырока.

Першая кніга — гэта зборнік прац Э.Смулковай, напісаных і апублікаваных у розныя гады. Прысвечаны яны пераважна або ў значнай ступені Беларусі, мове яе народа, рознага характару польска-беларускім кантактам і сувязям. Разглядаюцца ў іх і агульнатэарэтычныя праблемы.

Кніга складаецца з пяці раздзелаў, прадмовы і спісу прац аўтара.

Першы раздзел "Акцэнталогія, фанетыка і фаналогія" прысвечаны адзначаным у загалоўку кампанентам дыялектнай мовы. У раздзеле 10 артыкулаў. Напісаны яны пераважна на беларускім матэрыяле, у значнай ступені — на матэрыяле рускім, украінскім, польскім, літоўскім. Сярод высноў тэарэтычнага характару звернем увагу на наступныя.

Асаблівасці націску, як і іншыя сістэмы народных гаворак, папершае, могуць канстатаваць характар гаворкі, а па-другое, яе паходжанне.

У прыватнасці, у беларускіх гаворках больш позняга ўтварэння на паўночным захадзе Беларусі выразна выяўляецца балцкі субстрат. Гаворкі Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці адлюстроўваюць узаемаўплывы паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга дыялектаў. Асаблівасці націску гаворак "сярэдняга" Палесся сведчаць пра іх архаічнасць, а таксама ўзаемаўплывы ўсходне- і заходнепалескіх дыялектных сістэм.

Крытэрыі прадказальнасці націску або правілы акцэнтуацыі для такіх блізкароднасных моў, як беларуская і руская, у многіх выпадках розныя. Украінская мова ў гэтых адносінах, відаць, значна адрозніваецца і ад беларускай, і ад рускай моў.

Другі раздзел — "Марфалогія і лексікалогія дыялектаў беларускай мовы". У васьмі яго артыкулах выкарыстоўваецца дыялектны матэрыял з усяго рэгіёна пашырэння беларускіх гаворак. І ў той жа час асаблівая ўвага ўдзяляецца гаворкам Беласточчыны. Выдзяляюцца буйныя дыялектныя арэалы на падставе дадзеных акцэнтуацыі, марфалогіі, націску. Параўноўваюцца яны з фанетычнымі арэаламі. Разглядаюцца праблемы іх узаемасувязей і адрозненняў.

20 артыкулаў увайшлі ў склад трэцяга раздзела пад назвай "Моўныя кантакты". На Зямлі існуе мноства моў, дыялектаў, гаворак. Як правіла, яны існуюць не ізалявана, а ў кантактах і ўзаемасувязях паміж сабою. Таму гэтая тэма вельмі актуальная. Ёю займаюцца многія даследчыкі-гуманітарыі на ўсіх кантынентах. Працы Э.Смулковай па ўказанай тэматыцы прысвечаны даследаванню сувязей беларускай мовы і яе гаворак з мовамі польскай, літоўскай, рускай, украінскай і іх гаворкамі на розных узроўнях. Асаблівай увагі заслугоўвае тэарэтычны артыкул "Прапанова тэрміналагічнага звужэння абсягу паняццяў "пераходныя гаворкі" — "мясцовыя гаворкі".

У васьмі артыкулах чацвёртага раздзела пад назвай "З навуковага жыцця" падаецца інфармацыя пра дзейнасць кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і Мовазнаўчай камісіі Беластоцкага навуковага таварыства. Публікуецца прамова аўтара на адкрыцці Другога Міжнароднага кангрэса беларусістаў. Чатыры артыкулы прысвечаны памяці вядомых людзей і інфармацыі пра іх дзейнасць. Гэта прафесары А.Абрэмбская-Яблонская, Л.Асоўскі, а таксама Г.Карпенка, В.Вярэніч. Асобны артыкул прысвечаны пісьменніку-публіцысту Я.Гарэліку.

Пяты раздзел "Беларусь — Польшча. Грамадска-палітычныя праблемы" аб'ядноўвае шматлікія артыкулы, прысвечаныя разнастайным грамадскім, палітычным, культурным і іншым сувязям Беларусі і Польшчы.

Другая кніга — гэта зборнік навуковых прац, прысвечаных 70-годдзю Э.Смулковай. Аўтары зборніка — яе калегі, сябры, вучні, супрацоўнікі. Сярод аўтараў — беларускія даследчыкі Г.Арашонкава, Л.Выгонная, А.Жураўскі, А.Крывіцкі, І.Кур'ян, В.Лабачэўская, А.Мальдзіс, С.Мінскевіч, Н.Мячкоўская, А.Семянчук, А.Смалянчук, Н.Усава, Г.Цыхун, А.Янушкевіч, І.Яшкін і іншыя.

Зборнік тэматычна складаецца з уступнага і трох асноўных раздзелаў, якія адпаведна прысвечаны сумежжам моў, культур і гісторыі даследавання сумежжаў. У большасці прац шырока прадстаўлена беларуская тэматыка.

Уступны раздзел даволі спецыфічны. Гэта інтэрв'ю аднаго з рэдактараў зборніка, А.Энгелькінг, з прафесарам Э.Смулковай і бібліяграфія прац Э.Смулковай да 2002 года. У інтэрв'ю Э.Смулкова расказала пра свой жыццёвы і творчы шлях, сувязі з Беларуссю.

Асноўны раздзел кнігі "Пагранічча моваў" прысвечаны дыялекталогіі, гісторыі, анамастыцы, сацыялінгвістыцы славянскіх моў і мовы літоўскай, а таксама тэарэтычным праблемам моўнага пагранічча і міжмоўных кантактаў.

У другім раздзеле, "Памежжы культур", разглядаюцца праблемы гістарычныя, культуразнаўчыя і сацыялагічныя. Яны адлюстроўваюць разнастайныя працэсы, якія адбываліся на працягу стагоддзяў пераважна на той шматкультурнай і шматэтнічнай прасторы, што ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Трэці раздзел, "Засваенне пагранічча: даследчыкі і творцы", узбагачае чытача звесткамі пра выдатных дзеячаў культуры, пра іх дзейнасць, якая звязана з тым або іншым рэгіёнам. У агульны кантэкст гэтага раздзела ўпісваецца асоба прафесара Э.Смулковай, якой прысвячаецца зборнік.

Як бачым, тэматыка зборніка разнастайная. У той жа час працы, якія ўвайшлі ў гэтую кнігу, утвараюць пэўнае адзінства. Іх тэматыка канцэнтруецца ў коле асноўных навуковых зацікаўленасцей Э.Смулковай.

Трэба прыгадаць, што прафесар Э.Смулкова стаяла ля вытокаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Гэта па яе ініцыятыве ў 1990 годзе ў Варшаве ўпершыню сабраўся Арганізацыйны камітэт МАБ.

Фёдар КЛІМЧУК,
кандыдат філалагічных навук.

Хроніка падзей

Паніхіда па Іосіфу Гашкевічу

У Петрапаўлаўскім праваслаўным саборы на Нямізе 17 кастрычніка адбылася паніхіда па выдатным вучоным і падарожніку, першым консуле Расіі ў Японіі Іосіфу Гашкевічу.

Яму, ураджэнцу зямлі беларускай, двойчы прысвячаліся чытанні, якія арганізоўваліся Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў.

Паніхіду на беларускай мове адслужыў айцец Генадзь Будзько. Спяваў хор брацтва Святых Віленскіх Мучанікаў. Прысутныя атрымалі выдадзены сёлета зборнік матэрыялаў Другіх Гашкевічаўскіх чытанняў. Ініцыятарам паніхіды выступіла Ала Ходан, якая ўзначальвае грамадскае аб'яднанне "Беларуская хатка".

У сусветным кантэксце

На філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта прайшла VI Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай".

У канферэнцыі прынялі ўдзел вядомыя беларусісты і славісты Арнольд Макмілін (Вялікабрытанія), Валянціна Нарыўская (Украіна), Мікола Мішчанчук, Вячаслаў Рагойша, Іван Чарота, Ірына Шаблоўская (Беларусь) і іншыя.

Галіна ВІР.

Новыя імёны

Андрэ Бём

За мяжой рэдка пішуцца даследаванні, прысвечаныя творчасці асобных беларускіх пісьменнікаў. Таму асабліва прыемна, што ініцыятарам навуковага кантакту на гэты раз выступіў не знаны беларусіст, а малады навуковец. Дыялог і навуковае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Германіяй працягваецца. Расце новая і вартая змена беларусістаў.



Яркім сведчаннем таму — абарона магістарскай працы, прысвечанай творчасці вядомага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Аўтар даследавання — выпускнік філалагічнага факультэта Інстытута славістыкі Лейпцыгскага універсітэта Андрэ Бём. Яго праца — своеасаблівы працяг вывучэння творчасці нашага славутага суайчыннніка. Але, у адрозненне ад добра вядомых айчынных і замежных даследчыкаў, А.Бём зрабіў удалую спробу разгледзець творы У.Караткевіча нетрадыцыйна, па-новаму. Таму даследчык выбраў тэму "Карціна свету і *канцэпцыя фігур* у выбраных эпічных творах Уладзіміра Караткевіча". Напісанне такой працы, бясспрэчна, было немажліва без асэнсавання гісторыі Беларусі, асабістага знаёмства з краінай. А.Бём прыязджаў у Мінск, кансультаваўся ў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Ва ўступнай частцы аўтар вызначае адметнасць стылю У. Караткевіча, акрэслівае тэматыку і праблематыку яго твораў, адзначае асноўныя айчынныя і замежныя даследаванні, прысвечаныя творчасці пісьменніка. Прадметам вывучэння выбрана прадстаўленая ў пяці разнастайных творах У.Караткевіча карціна свету і фігуры, якія насяляюць свет, а таксама адносіны людзей да сусветнага парадку. З усёй спадчыны пісьменніка выбраны два раманы і тры аповесці. Асноўным крытэрыем для вылучэння іх тэкстаў стаў гістарычны час: гэта тэксты, падзеі ў якіх разгортваюцца ў XX стагоддзі: "Нельга забыць", "Лісце каштанаў", "Чорны замак Альшанскі", "У снягах драмае вясна". На думку аўтара, уключэнне ў гэты спіс аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" таксама апраўдана, але толькі ў сувязі з раманам "Чорны замак Альшанскі". Зыходзячы з заяўленай праблематыкі, аўтар падзяляе матэрыял на чатыры часткі: "Карціна свету", *"Канцэпцыя фігур"*, "Апавядальнік і спосаб апавядання як кампанент, што фарміруе карціну свету", *"Крытычная ацэнка ўнутрытэкставых прыкмет у структуры верхніх і глыбінных пластоў"*.

У даследаванні аўтарам глыбока асэнсоўваюцца некаторыя філасофскія паняцці, якія знаходзяць сваю інтэрпрэтацыю ў літаратурных творах і служаць для стварэння пэўнай карціны свету. Прыцягваючы багаты ілюстрацыйны матэрыял непасрэдна з творчасці У.Караткевіча, даследчык разважае пра дабро і зло, патрыятызм, гуманізм, жыццё для навукі, космас як своеасаблівы сусветны парадак з чалавекам у эпіцэнтры і г.д.

Значная ўвага надаецца ў працы аналізу персанажаў у іх узаемасувязі з агульнай канцэпцыяй твора і *канцэпцыяй фігур*. Аўтар прэзентуе свой погляд і сваё асабістае ўспрыняцце твораў беларускага пісьменніка, што выяўляецца пры асвятленні такіх пытанняў, як маральная цэльнасць героя, падтрымка героя, жанчына ў дачыненні да героя. Не застаўся без увагі асэнсаваны падыход пісьменніка да выбару імя героя.

У наступных частках даследавання аўтарам вылучаюцца схемы пяці выбраных твораў. На думку даследчыка, схематызм тут выяўляецца ў палярызацыі фігур — ад станоўчых да адмоўных, што ў некаторай ступені спрашчае маральную карціну свету. У гэтай сувязі аўтар адзначае асаблівасці трывіяльнай літаратуры і прыходзіць да высновы, што ўсе пяць названых твораў У.Караткевіча не належаць да ліку трывіяльных, паколькі ідэалістычна-рамантычнае адлюстраванне беларускай гісторыі і культуры, а, значыць, і беларускіх характараў, успрымаецца найперш як патрыятычнае нават і прадстаўнікамі іншых культур.

Дадатным бокам працы з'яўляецца ўдалае спалучэнне рознахарактарнай літаратуры па выбранай праблеме. Тэарэтычная аснова даследавання базіруецца на сучаснай нямецкамоўнай літаратуразнаўчай традыцыі з уключэннем філасофскіх трактатаў па эстэтыцы. Разам з тым, аўтарам выкарыстана найбольш значная айчынная і замежная літаратура, прысвечаная жыццю і творчасці пісьменніка. Спіс літаратуры вызначаецца паўнатой і скрупулёзным адборам.

Цікавасць выклікае таксама "Дадатак", прыкладзены да працы, у якім знайшла адлюстраванне пададзеная ў таблічным выглядзе сціслая характарыстыка персанажаў, якія, на думку аўтара, адыгралі ключавую ролю ў фарміраванні *канцэпцыі фігур*, і біяграфічныя звесткі з жыцця беларускага пісьменніка. У працы змешчаны таксама некалькі фотаздымкаў У.Караткевіча.

На наш погляд, аўтару ўдалося прадставіць творчасць У.Караткевіча як адметную і змястоўна глыбокую з'яву беларускай і еўрапейскай літаратур, акрэсліць, чым могуць зацікавіць і ўзбагаціць яго творы еўрапейскага чытача. Пры азнаямленні з працай відаць, што даследчык добра валодае беларускай мовай. Вывады аўтара ўяўляюцца пераканаўчымі, але зроблены яны, на жаль, на аснове абмежаванай колькасці твораў.

Літаратурная спадчына У.Караткевіча ўводзіць чытача ў беларускую культуру, часта малавядомую нямецкамоўнай аўдыторыі. Разам з тым, творы пісьменніка — гэта і скарбонка агульначалавечых вобразаў і характараў, азнаямленне з якімі робіць зразумелым і блізкім свет, у якім жывуць персанажы. Праз асэнсаванне месца і ролі герояў даследчык паспрабаваў глыбока і пранікнёна выявіць задуму аўтарскага тэксту, разгадаць адлюстраваную ў творах своеасаблівую карціну свету.

Хочацца павіншаваць маладога навукоўца і пажадаць, каб распачатае ім спасціжэнне Беларусі паслужыла трывалай асновай для далейшай грунтоўнай навукова-даследчай дзейнасці.

Кацярына ЛЮБЕЦКАЯ,
супрацоўніца Цэнтра імя Ф.Скарыны.

Імпрэза

Ушаноўвалі маскоўскага беларуса Міхаіла Расолава

Імя доктара юрыдычных навук і пісьменніка Міхаіла Расолава ўсё шырэй становіцца вядомым у Беларусі

Ураджэнец Рагачоўскага раёна, ён даўно звязаў свой лёс з Расіяй, Масквой, але ніколі не забываўся на родны край. Не выпадковым стаў і вечар у сталічным Доме літаратара, куды вітаць пісьменніка прыйшлі яго сябры, землякі, вучнёўская і студэнцкая моладзь Мінска.

Як пэўную справаздачу Міхаіл Расолаў прывёз у Мінск і сваю новую кнігу — восьмы том "Выбраных твораў", што пабачыў свет у маскоўскім выдавецтве "Рэспубліка". Пад адной вокладкай сабраны апавяданні розных гадоў. Дагэтуль у "Выбраных творах" былі выдадзены раманы "Жнівеньскі зоркапад", "На зямлі белых рос", "Сімвал маці", іншыя творы, якія ўжо знайшлі свайго чытача.

Пра творчасць Міхала Расолава, яго адданасць радзіме гаварылі на вечары старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Пашкевіч, драматург і празаік Васіль Ткачоў, свае цёплыя словы вітання маскоўскаму літаратару адрасавалі дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Уладзіслаў Мачульскі, пісьменнікі Зіновій Прыгодзіч, Раіса Баравікова, Навум Гальпяровіч, Фелікс Мысліцкі, Алесь Пісарык.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,
сябра ГА "МАБ".

З надасланага

«Родзічы»

Пасля дзесяцігадовага перапынку ўзнавіла выхад "незалежная газета пецярбургскіх беларусаў" "Родзічы". Цяпер яна стала спецыяльным выпускам органа Саюза пісьменнікаў "Шматнацыянальны Санкт-Пецярбург", які аб'ядноўвае літаратараў "ад Урала да Нявы".

Орган гэты называецца "Петербург многонациональный", а "Родзічы" ў ім рэгулярна, раз у квартал, "гасцююць". Галоўны "госць" — рэдактар выпуска беларускі пісьменнік Анатоль Кірвель. Дарэчы, у Санкт-Пецярбургу толькі што пабачыў свет яго чарговы зборнік "Сумная кніга пра звяроў: Амаль байкі".

Надасланыя нам другі і трэці нумары "Родзічаў" за бягучы год маюць тэматычны характар. Вядучае месца ў другім займаюць матэрыялы, прысвечаныя 70-гадоваму юбілею кіраўніка Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу Анатоля Грыцкевіча. Акрамя таго змешчаны ў арыгінале і перакладзе Донары Мкртчан на армянскую мову вершы Ніны Мацяш. Беларуская паэтэса Аўгіння Кавалюк, якая жыве ў Санкт-Пецярбургу, пераўвасобіла па-беларуску "Рубаі" башкірскі Альміры Бікулавай. У "паўночнай Пальміры" з'явілася новая беларуская паэтэса — Лана Успенская. У другім нумары "Родзічаў" яна сама праілюстравала свае вершы. Адна са старонак выдання прысвечана памяці паэта і скульптара беларуса Аляксандра Дабравольскага, які памёр у Санкт-Пецярбургу "ў поўным росквіце сіл і таленту". Яму прысвечаны чатыры вершы А. Кірвеля.

Трэці, ліпеньскі, нумар "Родзічаў" прысвечаны памяці Васіля Быкава. З успамінамі пра яго выступаюць Валянцін Грыцкевіч, Аўгіння Кавалюк і Анатоль Кірвель. Тэксты гэтыя, несумненна, вартыя, каб іх уключыць у зборнік успамінаў пра пісьменніка, які цяпер рыхтуецца да друку.

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Стасункі

Нас наведалі...

... прафесар Лонданскага універсітэта Арнольд МАКМІЛІН. Ён з'яўляецца аўтарам некалькіх кніг па гісторыі беларускай літаратуры, якія выдадзены на англійскай мове і ў перакладзе на беларускую. А. Макмілін падтрымлівае сталыя кантакты з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў і Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

У чарговы свой прыезд англійскі беларусіст перадаў нам для бібліяграфічнай калекцыі свой артыкул "Васіль Быкаў", надрукаваны ім 25 ліпеня 2003 года ў лонданскай газеце "The Guardian", а таксама іншыя матэрыялы, падзяліўся сваімі навуковымі планамі (а ў іх — найперш манаграфія пра беларускую літаратуру апошняга дзесяцігоддзя мінулага стагоддзя).

У бліжэйшы час наша газета мяркуе надрукаваць у перакладзе артыкул А.Макміліна "Скарына і дыяспара".

...супрацоўнік Інстытута гісторыі Літоўскай акадэміі навук доктар права Дарус ВІЛІМАС. Ён цікавіцца беларускай праблематыкай, выступіў летась на Міжнародным сімпозіуме "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі", які прайшоў у Мінску з удзелам ГА "МАБ", з дакладам, прысвечаным прынцыпам справядлівасці ў земскіх судах Вялікага княства Літоўскага.

На гэты раз Д.Вілімас прыехаў, каб папрацаваць у беларускіх архівах. Зайшоўшы ў рэдакцыю, ён паведаміў, што ў Вільнюсе, у складзе Літоўскай акадэміі навук, створаны Беларускі інстытут. Мы папрасілі госця напісаць або арганізаваць напісанне артыкула пра гэту падзею. Д. Вілімас перадаў нам кнігу Эдмундаса Гімжаўскаса "Беларускі фактар у фарміраванні літоўскай дзяржавы (1915–1923)". Спадзяемся яе адрэцэнзаваць.

Нас запрашаюць...

... у Санкт-Пецярбург. 13-15 лістапада там пройдуць Дні пецярбургскай філасофіі. У іх рамках адбудзецца канферэнцыя "Філасофскае прызванне і адказнасць", некалькі "круглых сталоў" і сімпозіумаў. Электронная пошта для кантакту: info@anthropology.ru, science@philosophy.pu.ru.

Гадавіны

Юбілейныя даты лістапада

1 лістапада спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння Івана ЗАМОЦІНА, беларускага і рускага літаратуразнаўца (1873-1942); 70 гадоў з дня нараджэння беларускага празаіка Вячаслава АДАМЧЫКА (1933-2001); 70 гадоў з дня нараджэння брэсцкага літаратуразнаўца сябра ГА "МАБ" Веры ЛЯШУК.

8 лістапада – 120 гадоў з дня нараджэння грамадска-палітычнага дзеяча, гісторыка, літаратуразнаўца Вацлава ЛАСТОЎСКАГА (1883 – 1938).

12 лістапада – 180 гадоў з дня нараджэння рускага і беларускага пісьменніка і этнографа Паўла ШПІЛЕЎСКАГА (1823-1861).

18 лістапада – 120 гадоў з дня нараджэння Язэпа ЛЁСІКА (1883-1940), беларускага мовазнаўца, пісьменніка, педагога.

21 лістапада – 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра МАКАРАВА, мовазнаўца, прафесара Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, удзельніка канферэнцый ГА "МАБ".

27 лістапада – 100 гадоў з дня нараджэння беларускага празаіка Піліпа ПЕСТРАКА (1903-1978).

28 лістапада – 75 год з дня нараджэння пісьменніка і перакладчыка Анатоля ЧАРКАСАВА (1928-2000). Быў сталым аўтарам "Голаса Радзімы".

У 2003 годзе спаўняецца 480 гадоў з часу выхаду ў Кракаве "Песні пра зубра" Міколы ГУСОЎСКАГА, паэта-лацініста, генетычна звязанага з беларускімі землямі.

У канцы 2003 года спаўняецца 90 гадоў з часу выхаду адзінага прыжыццёвага зборніка Максіма БАГДАНОВІЧА «Вянок». 8 снежня гэтай падзеі будзе прысвечана канферэнцыя ў музеі паэта ў Мінску.


Фота Сяргея ШАПРАНА.

Які ён розны і шматаблічны, Уладзімір Арлоў! Ягоныя кнігі ўражваюць фарматам, сціпласцю або, наадварот, раскошай афармлення, прастатой мовы і нечаканай яе вытанчанасцю. Грунтоўная "Таямніца Полацкай гісторыі", багата ілюстраваная "У пошуках украдзенага скарбу", шырокафарматная "Адкуль наш род", шыкоўная "Краіна Беларусь" (у сааўтарстве з З.Герасімовічам), якая стала візітоўкай нашай краіны, і мініяцюрна-кішэнныя "Там, за дзвярыма", "Фауна сноў". Назвы таксама ледзь не супрацьлеглыя па форме: строга навуковая "Дзесяць вякоў беларускай гісторыі" (сумесна з Генадзем Сагановічам) і займальна-папулярная "Рандэву на манеўрах", дакументальная "Еўфрасіння Полацкая" і аўтабіяграфічная "Мой радавод да пятага калена", постмадэрнісцкая "Рэквіем для бензапілы" і эсэістычна-іранічная "Божая кароўка зь пятай авэню". Незадоўга да 50-гадовага юбілею празаіка шэраг назваў папоўніўся за кошт не менш экзатычных – "Ордэн Белай мышы" і "Адкусі галаву вароне".

СЛОВА НІБЫ ПАРАТУНАК

Наўрад ці Арлоў свядома дамагаўся эфекту, хутчэй за ўсё, проста шукаў дакладныя словы, якія адпавядалі б задуме, а яны нечакана, мусіць, і для самога аўтара стварылі ў выніку разгалінаваную сетку каардынат яго творчасці, дзе ўсё звязана з усім. Гэта сетка, аднак, не нагадвае "таблицу Мендзялеева", якую можна штораз запаўняць назвамі новых хімічных элементаў. Арлоў непрадказальны. Такая сувязь "вертыкалі" і "гарызанталі" — мусіць, асаблівасць усіх пісьменнікаў, якія пішуць на гістарычную тэму. У. Арлоў лёгка пазнавальны ў падарожным нарысе і вострасюжэтнай навеле, ва ўлётцы і навукова-папулярнай гісторыі, у "вершах у прозе" і дэтэктыўных росшуках адказаў на загадкі беларускай мінуўшчыны. Мінулае, сучаснасць і будучыня ў яго творах туга завязаны ў вязьмо.

Нацыянальная сітуацыя патрабуе ад беларускага пісьменніка быць жняцом, шаўцом і на дудзе іграцом, зменліва-пластычным Пратэем, які лёгка пераўвасабляецца з празаіка ў паэта, з пісьменніка ў навукоўца, з кніжніка ў агітатара. Але ўсё гэта вонкавыя прыкметы індывідуальнага таленту Арлова. Ужо ў апавяданнях, якія з'яўляліся ў друку адно за адным, у самой іх танальнасці было нешта асаблівае, што вылучала аўтара нават на фоне яго літаратурнага настаўніка і куміра юнацтва Караткевіча. Іншы тэмперамент, іншае светаадчуванне, іншае пакаленне.

У творах Арлова на гістарычную тэму няма свядомай гіпербалізацыі, уласцівай карнавальнай культуры беларускага барока, такога караткевічаўскага, што паўтарыць яго немагчыма. Яны стрымана-лапідарныя, лаканічныя, графічна-строгія — па сюжэту, інтанацыі, пафасу. Нават жанр аповесці, на які Арлоў зрэдку адважваўся, больш нагадвае разгорнутую навелу з займальным сюжэтам і нечаканай развязкай. На жанр рамана ён не замахваўся, калі не лічыць своеасаблівымі раманамі яго "гісторыі" — свайго радаводу, Полацкага княства, Беларусі.

Пасля таго як гістарычная панарама маштабна ўзноўлена, застаецца шмат працы для вывучэння буйнога плана падзей. Дэталі і падрабязнасці, сэнсавыя канатацыі і нюансы часта кажуць куды больш пра мінулае, чым лёсаносныя падзеі. Для Арлова ёсць гісторыя падзей, а ёсць гісторыя людзей, і апошняя яго цікавіць больш. (Спадзяюся, што з узростам, пасля юбілейных 50-ці гадоў, яго зацікавіць і гісторыя ідэй). Такая гісторыя, населеная рэальнымі і прыдуманымі гістарычнымі персанажамі, нам бліжэй, чым абязлюдзелая прастора мінулага. Яна дазваляе адчуць чалавечы змест паўзабытых падзей, пра якія цяжка сказаць, былі яны на самай справе ці не былі наогул. Для "беспрыпыннай Беларусі" мае каштоўнасць усё, што яшчэ не скінута народам у няпамяць і што "засталося // Унукам з прадзедаў жыцця". Купалаўскі запавет збіраць "зярно к зярняці, былое ў думках ускрашаць" быў ацэнены менавіта Арловым належным чынам. Вядома ж, каб "сеўбу новую пачаць".

Вельмі часта прадметам мастацкага даследавання ў Арлова становіцца тое, што адбываецца пасля падзеі, калі больш выразна выступаюць вынікі і відочна вымалёўваецца магістральная лінія нацыянальнага развіцця. Апавяданне "Маналог Святога Пётры" вонкава нагадвае вядомыя "Апокрыф" і "Апавяданне аб іконніку і залатару" М.Багдановіча — гэта паданне, якое магло захавацца ў памяці беларусаў ажно да нашых дзён, калі яго падслухаў цікаўны да незвычайных гісторый і выбітных постацей аўтар.

Святы Пётра іранічна выслухоўвае апавяданне дзяўчыны-экскурсавода ў сучасным гістарычным музеі і ў думках увесь час папраўляе яе ў галоўным і ў дэталях, бо добра памятае пра тое, пра што людзі з іх кароткай памяццю забыліся. Добра памятае і аўтар апавядання. І калі ён выводзіць радавод святога з беларускіх майстравітых людзей, то яму варта верыць, як верым мы таленавітаму казачніку-выдумшчыку і фантазёру. Бацька яго Антось быў выдатным мастаком-штукаром, з-пад рук якога "выпырхвалі драўляныя жаўрукі, львы на падлакотніках крэслаў, не паспеўшы нарадзіцца, хапалі зубамі разец, а па мядзведзю, якога мой бацька выштукаваў у паляўнічай зале, аднойчы пекануў з рушніцы зляканы княскі госць". Маналог Святога Пётры завяршаецца ўпэўненасцю ў тым, што "пакуль ёсць сейбіты, будуць і ўсходы": "Хіба могуць вякі велічы, перамог і пакутаў пакінуць па сабе толькі тло?"

У апавяданні "Каля Дзікага Поля" ўзнаўляецца эпізод пасля чарговай сутычкі ўсходніх славян з татарвой, у якой, паводле версіі аўтара, мог удзельнічаць і магчымы аўтар "Слова аб паходзе Ігаравым". У дадатак да вядомых канцэпцый Дзмітрыя Ліхачова і Алжаса Сулейменава (паводле версіі аднаго, аўтарам "Слова" быў русіч, паводле версіі другога — продак кіпчакоў-казахаў) высоўваюцца свае аргументы наконт аўтарства геніяльнага твора, які сёння лічыцца асобнымі даследчыкамі геніяльнай падробкай. Маўляў, узнікла гістарычная патрэба ў асвяшчэнні гераічнага мінулага Старажытнай Русі, а адказам на гэта запатрабаванне стаў твор-падробка. Пры гэтым не ўлічваецца элементарная ў мастацкай творчасці ўмова — феномен генія, які здольны на стагоддзі апярэджваць нашы ўяўленні і веды пра свет і сябе, і выяўна перабольшваецца роля гістарычнай неабходнасці. Геній — гэта і ёсць адказ Бога на нашы пытанні. Апавяданне Арлова можа таксама служыць аргументам на карысць сапраўднасці "Слова": адкуль мог чэх, яшчэ адзін магчымы, паводле сумніўнай версіі Эдварда Кінана, аўтар, ведаць пра князя Усяслава Чарадзея, пра Нямігу, а тым больш пра рэчку Улу, пра якую не кожны сучасны беларус чуў? А самае галоўнае — напісаць пра ўсё гэта з такім пранізлівым лірызмам!

Акрамя мастацка-чалавечага боку, у гэтых творах шмат спасылак на летапісы і іншыя чыста навуковыя даныя, якія лішні раз пераконваюць, што перад намі не фантазія аўтара, а вынік яго развагі і аналізу. Але самае галоўнае, што гістарычныя навелы Арлова ўзнаўляюць недаступны для многіх сучаснікаў узровень духоўнага разумення гісторыі, нацыянальнай і сусветнай. Менавіта гэта ўражвае ў яго апавяданнях "Пакуль не згасла свечка", "Пяць мужчын у леснічоўцы", "Рандэву на манеўрах", у аповесцях "Дзень, калі ўпала страла", "Час чумы", "Сны імператара". Эпіцэнтр гістарычных падзей, на якім былі столькі часу засяроджаны позіркі аналітыкаў, у творах Арлова прыкметна змясціўся на перыферыю, і ў выніку выявілася, што тое, што знаходзілася на ўскрайку гістарычнай свядомасці, і ёсць сапраўдны эпіцэнтр, бо не Меч вырашае лёс цывілізацыі, а Дух — ісціна даўняя, відавочная, якая, аднак, увесь час патрабуе напамінку аб сабе, пацвярджэння і актуалізацыі.

Вертыкальная вось каардынат гістарычнага існавання, якая спачатку будавалася Арловым па лініі ад мінулага да сучаснасці, неўзабаве дапоўнілася лініяй, якую празаік вёў ад сучаснасці ў мінулае. Так узнік цыкл апавяданняў-даследаванняў, якія ўсё больш нагадвалі разняволенае эсэ, падарожжа па гістарычнай прасторы на працягу дзесяцігоддзяў і стагоддзяў і якія набылі вядомасць пад назвай "Мой радавод да пятага калена". Перад намі ўжо прыкметна іншы Арлоў, што жыве і актыўна дзейнічае ў сучаснай "гарызанталі", якая дапамагае ўбачыць яго творчасць як своеасаблівую свядома выбудаваную і грунтоўна прадуманую сістэму каардынатаў, дзе кожны твор, сюжэт, вобраз, дэталь займаюць сваё месца. У якасці гісторыка Арлоў пераканаўся ў дакладнасці ісціны, што застаецца толькі напісанае летапісцамі, гісторыкамі, пісьменнікамі, а ў якасці мастака слова ён упэўніўся ў тым, што жыццё багацейшае за ўсякае ўяўленне, што многае застаецца па-за ўвагай сучаснікаў, а без шматлікіх падрабязнасцей прыватнага жыцця чалавека немагчыма па-сапраўднаму адчуць містэрыю быцця.

Гэты творчы прынцып у падыходзе да сваёй мастакоўскай задачы выдатна прадэманстраваны ва ўжо хрэстаматыйным творы "Незалежнасць — гэта..." Што такое ідэя незалежнасці, само гэта паняцце? Дэфініцыя ў слоўніку мала што дае ўяўленню, а вось нагляднае, карціннае тлумачэнне, каментарый мастака слова, таленавітага і сумленнага, разумнага і вопытнага чалавека, які ўпэўнена вядзе сваю лінію досведу, што такое мастацкая літаратура ў жыцці нацыі і як яна ўплывае на станаўленне асобы, на выспяванне яе гістарычнай і нацыянальнай самасвядомасці, стакроць узбагачае змест гэтага паняцця, цэнтральнага ў іерархіі духоўных каштоўнасцей чалавецтва і ўсё яшчэ перыферыйнага ў свядомасці беларусаў. Той жа творчы, метадалагічны, кажучы лексікай вучоных, прынцып ляжыць у аснове пісьменніцкай працы Уладзіміра Арлова. Гісторыя сучаснасці ў яго шматлікіх эсэ, якія ўвайшлі ў кнігі "Божая кароўка зь пятай авэню" і "Адкусі галаву вароне", апавяданнях і аповесцях "Рэквіему для бензапілы" і "Ордэна Белай мышы" "прадстаўлена як грунтоўна распрацаваная, дэталёва прапісаная панарама сучасных падзей, у цэнтры якіх заўсёды аўтарскае "Я" з яго выразнай пазіцыяй, гуманістычна-іранічнымі адносінамі да паказу, гумарам, скрухай, лірыкай, роздумам, непаўторным арлоўскім горкім сарказмам у адносінах да такой недасканалай чалавечай прыроды, няздольнай узвысіцца над хадой часу.

На самым перакрыжаванні арлоўскай "вертыкалі" і "гарызанталі" знаходзяцца ягоныя вершы ў прозе, напісаныя, на першы погляд, як бы толькі для самога сябе, своеасаблівыя ўрыўкі з інтымнага дзённіка. Тут ёсць згадкі пра жорны, якія смяюцца "голасам маці", спяваюць "голасам бабы Аўгінні", лаюцца "голасам дзеда Максіма", пра першае каханне, калі лірычны герой зрабіўся відушчым і ў той жа час не пазбавіўся слепаты, авалодаў сутнасцю слоў, але яны выйшлі з-пад яго ўлады, ён прагне сустрэчы з самім сабой, адчуваючы тым часам, як "кожны новы дзень аддаляе мяне ад мяне", як "сустракаюцца раўналегласці, дзе знікае і нараджаецца час, дзе будучыня была, а мінулае яшчэ будзе", "дзе мяне не будзе" і "дзе мяне не было". Мінулае і сучаснае ў вершаказах існуюць побач ва ўяўленні лірычнага героя, вечнага вандроўніка, цікаўнага назіральніка і вясёлага ўдзельніка ўсенароднага карнавалу: "Нешта дзеецца з часам: стагоддзі набываюць розную працягласць і шчыльнасць і, што самае небяспечнае, пачынаюць дыфузіраваць, у выніку чаго твой 1994-ты можа апынуцца дзе-небудзь паміж Вялікай французскай рэвалюцыяй і Луі Філіпам..." Адчуванне сябе на краі XX стагоддзя абвастрае ў героі ўспрыняцце Вялікага Часу гісторыі, у якой ёсць месца і для беларусаў.

Арлоў назаўсёды заварожаны містэрыяй зямнога быцця, у якой удзельнічае, якую ў той жа час назірае збоку, аб якой імкнецца распавесці іншым. І не толькі сваім сучаснікам. Альбо будучым чытачам. Але, здаецца, і тым, каго ўжо няма. Хто пражыў свой век, ды так і не дачакаўся запаветнага слова. Гэта напаўняе яго голас бясконцай скрухай, у якой зіхціць іскрынкамі, як шэрань у месячную ноч, незабыўная арлоўская іронія, дзіця вялікай іроніі гісторыі.

Міхась ТЫЧЫНА.

P.S. *Часам сустракаю Уладзіміра Арлова на нашай вуліцы (мы з ім суседзі), калі ён робіць прабежку ў шортах вакол квартала. Міжволі азіраюся: ад каго ён уцякае? Можа, ад міліцыянтаў, якія не ведаюць, што ён даўно стала прапісаны ў сталіцы, больш таго, у самой гісторыі літаратуры? А можа, ён здаганяе якую-небудзь прыгажуню, бо які ж гэта мастак слова, калі не смуткуе аб хараستве і дасканаласці? Ды прыгадаў радкі Б.Пастарнака (у перакладзе): "Аднойчы Гегель незнарок //Ці, можа быць, наўгад//Назваў гісторыка – Прарок, //Які прадказвае назад". І скеміў: Арлоў адыходзіць назад, у мінулае, каб набраць належны разгон, адным рыўком пераскочыць чорную прорву забыцця, якая раскрылася перад намі, беларусамі, і апынуцца ў царстве свабоды. Добры прыклад для ўсіх.*

подыум

"МІСТЭР-МАДЭЛЬ" з БАБРУЙСКА

АНДРЭЙ АДЖБА НА СУСВЕТНЫМ КОНКУРСЕ ПЕРАМОГ У ТРОХ НАМІНАЦЫЯХ З ДЗЕВЯЦІ

У Іспаніі на конкурсе "Містэр мадэль свету", прыдзірліва агледзеўшы 28 канкурсантаў з розных краін свету, міжнародная камісія вызначыла беларуса – Андрэя Аджбу. Наш суайчыннік дастойна прадставіў сваю краіну і атрымаў перамогу ў намінацыях "Лепшы нацыянальны касцюм" і "Лепшае прадстаўленне сваёй краіны". А за прыродныя даныя ўзнагародай яму стала перамога ў намінацыі "Самы прыгожы твар". Вось так, ні многа, ні мала, тры намінацыі з дзевяці магчымых. І, самае галоўнае, – трэцяе месца ў конкурсе.

Два гады Андрэй з'яўляецца мадэллю бабруйскай студыі "Бамонд", акрамя таго працуе аператарам на шынным камбінаце і вучыцца ў Сучасным гуманітарным інстытуце.

Пасля конкурсу Андрэю прапанавалі кантракт з вядомым мадэльным агенцтвам. Так што глядзіце "Fashion-TV" – на сусветных подыумах становіцца ўсё больш нашых.

Галіна ВІР.

кіно

14 ЛЕПШЫХ

4-ты Нацыянальны кінафестываль завяршыўся. Журы, якое ўзначальваў узбекскі рэжысёр Алі Хамраеў, назвала пераможцаў у 14 намінацыях.

Пералічым некаторыя з іх. Лепшым мастацкім фільмам названы "Павадыр" рэжысёра Аляксандра Яфрэмава, лепшым анімацыйным — "Музыкант-чарадзей" Алены Туравай, дакументальным — "Салдаты Італіі" Анатоля Алая.

Лепшым рэжысёрам прызнаны Валерый Рыбараў, які зняў мастацкі фільм "Прыкаваны", а лепшым сцэнарыстам — аўтар тэлесерыяла "Сяброўка Восень" Юлія Ляшко.

Прыз за лепшую жаночую ролю атрымала Святлана Кажамякіна, якая знялася ў кароткаметражным фільме "Каханне?..", лепшая мужчынская роля засталася за Уладзімірам Гасцюхіным — ён сыграў яе ў фільме "Прыкаваны". Гран-пры за лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы ўручылі рэжысёру відэафільма "Апошнія арлы" Ігару Бышнёву.

Многім удзельнікам фестывалю былі ўручаны спецыяльныя дыпломы журы.

НА ЗДЫМКУ: прыз "Крыштальны бусел" за лепшы мастацкі фільм прадстаўнікам творчай групы карціны кінарэжысёра Аляксандра ЯФРЭМАВА "Павадыр" уручае старшыня Брэсцкага гарвыканкама Мікалай ГАРДЗІЕВІЧ.

Фота **Рамана КАБЯКА**, БелТА.

уражанні



ПАДАРОЖЖА Ў ВОСЕНЬ

Сонечныя промні праніклі ў дом і асвяцілі пакой. Я прачнулася, усміхнулася, паднялася, прыгатавала снеданне, і раптам захацелася прайсціся па садзе.

Зайшла да малодшага брата, а ён спіць. Саша доўга не хацеў уставаць з цёплага ложка, але ўрэшце неахвотна паплёўся да ўмывальніка. «Вось і добра, — падумала я, — значыць, абодва запомнім гэты восеньскі дзень».

У садзе было цудоўна: сонца толькі пачало падымацца, свежае паветра бадзёрыла.

Спачатку мы вырашылі прайсціся каля пышных рабін, што растуць вакол дома. На дрэвах вялікія, яшчэ росныя гронкі чырвоных ягад.

Спусціліся ніжэй і выйшлі да ракі. Доўга глядзелі на хвалі, якія б'юцца аб камяні, на лісце, што плыло ўдалечыні, на хлопчыкаў-рыбаловаў. Яны злавілі трох карасёў і акунька, а наш сябар выцягнуў невялікага шчупака. На прыстані мы прабылі чатыры гадзіны, якія праляцелі вельмі хутка і пакінулі шмат уражанняў. Але надышоў час абеду, і ўсе пачалі разыходзіцца.

Фота Вольгі ЗАРАВАЙ.

Мама ўбачыла нас здалёку і, заліваючыся смехам, заспяшалася насустрач. Услед за ёю бегла гуллівае, амаль чорнае шчаня. Яно мне адразу спадабалася. Я працягнула яму крыху булкі і падумала: ці будзе есці з чужых рук? Але Жучок, відаць, яшчэ неразумны, таму адразу ўсё з'еў. А потым сеў і весела завіляў хвастом.

Я паглядзела на гадзіннік: час садзіцца за ўрокі. Настрой быў добры, бо адчувала, што гэтая прагулка ў прыгожы восеньскі дзень застанецца незабыўным уражаннем.

Ала МАЛЫШАВА, школьніца.

г. Жодзіна, Мінская вобл.

спадчына

"МОДА – ПОГЛЯД ПРАЗ СТАГОДДЗІ"

Так называецца выстава гістарычнага касцюма, арганізаваная Беларускім саюзам майстроў народнай творчасці. Яна праходзіць з 3 кастрычніка па 3 лістапада ў Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці.

Гэта мастацкія рэканструкцыі і імправізацыі на тэму строяў еўрапейскай моды XII–XVII стагоддзяў. Разам з творамі майстроў Ірыны Корабавай, Ларысы Шылак, Наталлі Кананові, Ірыны Штэфан і іншых тут прадстаўлены дыпломныя работы студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Усе яны ўражваюць мастацкім густам, разнастайнасцю творчых ідэй і культурай выканання. Акрамя

строяў, абутку і галаўных убораў, на выставе можна ўбачыць шматлікія аксесуары з металу, бісеру, скуры і тканіны.

Дапытлівыя наведвальнікі прыходзяць сюды, каб атрымаць падрабязныя кансультацыі, паслухаць лекцыі па гісторыі касцюма, навучыцца ткаць паясы і паглядзець відэафільмы пра сучасныя рыцарскія турніры, а некаторыя ажыццяўляюць падарожжа ў часе, сфатаграфаваўшыся ў строях, прадстаўленых на выставе.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

НА ЗДЫМКАХ: на выставе; дыпломны праект студэнтаў БДПУ імя М.Танка ПАРФЯНОВІЧАЎ "Гісторыя Беларусі ў касцюмах XVI–XVII стагоддзяў"(лялькі);

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82, (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029-6-88-17-82. E-mail: golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж 2 148 экз. Заказ 1522. Падпісана да друку 28. 10. 2003 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана на паліграфічным РУП «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).